*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 11. ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ.

1. **Напішыце эсэ**: «Ці існуе жаночая паэзія»? Выкажыце ў ім думку пра тое, што аб’ядноўвае і адрознівае творчасць А. Ахматавай (М. Цвятаевай) і Я. Янішчыц.
2. Падрыхтуйце **мультымедыйную прэзентацыю** пра жыццёвы і творчы шлях Яўгеніі Янішчыц.

3. Знайдзіце верш Яўгеніі Янішчыц пра паэта і паэзію, падрыхтуйце яго *выразнае чытанне*. Паспрабуйце на канкрэтных прыкладах паказаць сэнсавызначальную і эстэтычную ролю рытму, тропаў, асаблівасці кампазіцыі, паэтычнага сінтаксісу і гукапісу. Як асаблівасці паэтычнай формы звязаны са зместам твора?

4. Зрабіце поўны аналіз верша Яўгеніі Янішчыц, які вам асабліва спадабаўся, выкарыстоўваючы алгарытм:

1. *Час напісання.*
2. *Біяграфічны і фактычны каментарый.*
3. *Ідэйны змест:*

*а) галоўная тэма;*

*б) асноўная думка;*

*г) эмацыйная афарбоўка пачуццяў, адлюстраваных у вершы ў іх дынаміцы або статычна;*

*д) знешняе ўражанне і ўнутраная рэакцыя на яго;*

*ж) перавага грамадзянскіх або асабістых інтанацый аўтара.*

4. *Структура твора:*

*I) параўнанне асноўных вобразаў:*

*а) па падабенству;*

*б) па кантрасту;*

*г) па асацыяцыі.*

*II) асноўныя выяўленчыя сродкі, выкарыстаныя аўтарам: метафара, эпітэт, метанімія, параўнанне, алегорыя, сімвал, гіпербала, літота, іронія (як троп), сарказм, перыфраза, мастацкая дэталь;*

*III) інтанацыйна-сінтаксічныя фігуры: паўторы, антытэза, інверсія, паралелізм, рытарычнае пытанне;*

*IY) асаблівасці рытмікі:*

*а) тоніка, сілабіка, сілаба-тоніка, верлібр, белы верш;*

*б) ямб, харэй, дактыль, анапест, амфібрахій;*

*Y) рыфма (мужчынская, жаночая, багатая) і спосабы рыфмоўкі (парная, крыжавая, кальцавая);*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*YI) гукавая інструментоўка (алітэрацыя, асананс).*

5. *Жанравая адметнасць.*
6. *Уласныя ўражанні і ацэнкі.*

5. Творчасць Яўгеніі Янішчыц – ластаўкі з Палесся – вывучана ў дастаткова поўным аб'ёме: раскрыта яе агульная эвалюцыя, спецыфіка вобразнасці, жанравая шматграннасць, паказана своеасаблівасць індывідуальнага стылю паэткі. Аднак асобныя аспекты творчасці, найбольш складаныя, што палягаюць у сферы сумежжа розных відаў мастацтва – слоўнага, музычнага, жывапісу, – закрануты слаба. У ліку такіх аспектаў вывучэння спадчыны паэткі і праблема яе колеравай палітры. Вызначце дамінантныя колеры лірыкі паэткі. **Запішыце** ў літаратурны сшытак іх семантыку ў выглядзе табліцы.

| № п/п | Колер | Верш | Значэнне | Цытата |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

6. Падрыхтуйце **паведамленне** «Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Яншчыц».

7. Складзіце **паэтычную анталогію з вершаў паэтак вашага рэгіёна**.

8. Падрыхтуйце **водгук** на любімы твор Яўгеніі Янішчыц.

9. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Яўгеніі Янішчыц:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ